# Агроусадьба «Автюки»

**АГРОУСАДЬБА «АВТЮКИ» РАСПОЛАГАЕТСЯ ПО АДРЕСУ: УЛ. МИРА, 27, АГРОГОРОДОК МАЛЫЕ АВТЮКИ, КАЛИНКОВИЧСКИЙ РАЙОН, ГОМЕЛЬСКАЯ ОБЛ.**

Музейна-этнаграфічны комплекс

**АГРАСЯДЗІБА «АЎЦЮКІ»**

– турыстычныя паслугі
– калектыўны адпачынак
– вырабы з дрэва
– сувенірная прадукцыя

# Калектыўны адпачынак

+375 33 **681-05-91** e-mail: ragatuha@tut.by



Усебеларускі фестываль гумару праводзіцца ў Аўцюках з 1995 году і за гэты час паставіў назву вескі пад Калінкавічамі ў адзін шэраг з такімі прызнанымі цэнтрамі гумару, як Габрава, Адэса, Сарочынцы.

Сядзіба-музей народнага гумару «Аўцюкі» – своеасаблівы «родны кут» неразлучнай пары Каласка і Калінкі – урачыста адчынена ў 2012 годзе на чарговым VII Усебеларускім фестывалі народнага гумару і па праву лічыцца своеасаблівым фарпостам беларускага народнага гумару.

У Сядзібе сабраныя прадметы старажылаў вескі: пранніцы, самавар, чугунныя прасы і ткацкі станок. Госці тут змогуць правесці ноч у ложку-санях, прыгатаваць нацыянальную страву нашай краіны – дранікі – у сапраўднай старажытнай печы, паспрабаваць аўцюкоўскі самагон і, канешне ж, паглыбіцца ў атмасферу беларускага гумарыстычнага фальклору і каларыту.

Правядзенне карпаратыўных мерапрыемстваў, прэзентацый, юбілеяў і нацыянальных святаў.










**Музейна-этнаграфічны комплекс**

АГРАСЯДЗІБА

# «Аўцюкі»



**МОЖНА ЗАМОВІЦЬ:**

– турыстычныя паслугі
– калектыўны адпачынак
– вырабы з дрэва
– сувенірная прадукцыя

У Навасёлках наведвальнікі могуць пазнаёміцца з хатамі, у якіх у розны час жыў Талаш са сваёю сям'ёй. У музейнай экспазіцыі прадстаўленыя экспанаты, якія распавядаюць пра жыццё, баявы шлях Талаша і яго аднавяскоўцаў.

*герб г. Петрыкава*



Аўцюкі — беларуская сталіца гумару. Не здарма, менавіта, тут быў адчынены Музей гумару. У экспазіцыі прадстаўлены аўтарскія працы беларускіх карыкатурыстаў і мастакоў, фотаздымкі з яркімі момантамі фестываляў розных гадоў, пацешныя прадметы быту.





*герб г. Турава*




Знаемства з гісторыяй і культурай старажытнага Турава і Тураўскай зямлі пачынаецца з наведвання гісторыка-археалагічнага музея. Турыстам змогуць наведаць старажытныя Барысаглебскія могілкі. Менавіта тут, у сярэдзіне 12 стагоддзя знаходзіўся Барысаглебскі манастыр, дзе ў свой час жыў беларускі асветнік — Кірыла Тураўскі. У старой частцы могілак, на месцы старажытнага манастыра, знаходзяцца вядомыя каменныя крыжы. Многія веруючыя, паломнікі і турысты імкнуцца наведаць цудадзейныя крыжы і папрасіць дапамогі, здароўя і абароны ў Тураўскіх святых.

Пад час экскурсіі, прапануем наведаць царкву Усіх Святых — адзіную драўляную царкву, якая захавалася ў Тураве.




«Музей прыроды» ў аграгарадку Ляскавічы з'яўляецца буйнейшым музеем такога плану ў краіне. Музейная экспазіцыя знаёміць сваіх наведвальнікаў з прыгажосцю палескіх ландшафтаў, біялагічнай разнастайнасцю края, а таксама з традыцыямі, бытам і заняткамі палешукоў.

Юравічы — адзін з самых унікальных пунктаў турыстычнага маршруту «Залатое кальцо Гомельшчыны». Менавіта тут наведвальнікі могуць сваімі вачыма ўбачыць месца стаянкі першабытнага чалавека і сапраўдныя рэшткі мамантаў. У Юравічах знаходзіцца і самае вялікае сярэднявечнае гарадзішча 12-13 ст. на тэрыторыі Усходняга Палесся. Згодна з легендаю, на гэтым месцы знаходзіўся старажытны горад Межымосцце. Па іншай версіі, магчыма, тут знаходзіўся старажытны горад Тураў.

Нельга абайсці ўвагай былыя калегіум і касцёл, заснаваныя іезуіцкі ордэнам манахаў-бернардынцаў у XVIII ст. Гэты вялізны комплекс быў вазведзены як рэлікварый для цудадзейнага абраза Маці Божай Юравіцкай.



**г. Калінкавічы / Мазыр — д. Навасёлкі — а/г Ляскавічы — а/г Юравічы — а/г Малыя Аўцюкі**

**г. Калінкавічы / Мазыр — г. Тураў — а/г Ляскавічы — а/г Малыя Аўцюкі**




**Музейна-этнаграфічны комплекс**

**АГРАСЯДЗІБА «АЎЦЮКІ»**

— турыстычныя паслугі
— калектыўны адпачынак
— вырабы з дрэва
— сувенірная прадукцыя

# Турыстычныя паслугі

+375 33 **681-05-91** e-mail: ragatuha@tut.by


КАРЧМА
ЛИДСКОЕ ПИВО


2012









Агроусадьба народного юмора

«Автюки»

МУЗЕЙНО-ЭТНОГРАФИЧЕСКИЙ КОМПЛЕКС


**Драгун**
**Александр Викторович**
*владелец*

tel/viber/whatsApp:
+375 333 809 809

e-mail: ragatuha@tut.by
aleksandr.v.dragun@gmail.com

247719, Республика Беларусь,
Гомельская область
Калинковичский р/н,
а/г. Малые Автюки, ул. Мира, 27